3 (128)
сакавік

Выдаецца са студзеня 1993 г.

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1221 ад 8 лютага 2010 г.

Выходзіць 12 разоў у год (з ліпеня 2003 г.)

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

## НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС

**Заснавальнікі:**

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны універсітэт

*Галоўны рэдактар Васіль Кушнер*

*Рэдакцыйная калегія:*

Сымон Барыс (рэдактар аддзела), Канстанцін Бандарэнка, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Максім Гальпяровіч (намеснік галоўнага рэдактара), Анатоль Грыцкевіч, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Надзея Кушнер (рэдактар аддзела), Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Барыс Ляпешка, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Вячаслаў Селяменеў, Аляксандр Смолік, Васіль Стражаў, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.

*Рэдакцыйная рада:*

Уладзімір Адамушка, Тамара Анціховіч, Юрый Бохан (старшыня рады), Васіль Бушчык, Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Вячаслаў Даніловіч, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Андрэй Каракін, Аляксандр Каханоўскі, Іван Крэнь, Валерый Марозаў, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Ян Мілеўскі, Антон Мірановіч, Сяргей Новікаў, Вольга Нячай, Васіль Ракуць, Сяргей Рашэтнікаў, Таццяна Румянцава, Віталь Скалабан, Алег Слука, Мікалай Сташкевіч, Валерый Талкачоў, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Анатоль Шаркоў, Захар Шыбека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### ЗМЕСТ

**ДЗЯРЖАВА І ПРАВА**

Леанід Землякоў, Мікалай Шчокін — Праблема "адукацыя і рэлігія" ў кантэксце дзяржаўна-канфесіянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь — 3

**ЭТНАГРАФІЯ**

Аляксандра Раманюк — Рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці намітак Усходняга Палесся канца XIX—пачатку XX ст. — 12

Паліна Богдан — Мастацкія асаблівасці традыцыйных беларускіх паясоў — 17

**ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ**

Віталій Галубовіч — Палітычная сістэма Вялікага княства Літоўскага ў 1588—1648 гг. — 26

**ЛЮДЗІ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ**

Аляксандр Каваленя, Валянцін Мазец — Кіравацца праўдай гісторыі (*Да 70-годдзя з дня нараджэння Міхаіла Паўлавіча Касцюка*) — 34

Людзі гістарычнай навукі

# КІРАВАЦЦА ПРАЎДАЙ ГІСТОРЫІ

*(Да 70-годдзя з дня нараджэння Міхаіла Паўлавіча Касцюка)*

Вядомы беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, прафесар Міхаіл Паўлавіч Касцюк 26 сакавіка адзначае сваё 70-годдзе.

Нарадзіўся ён у 1940 г. у вёсцы Масцішча Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і. Бацькі будучага вучонага — Павел Іосіфавіч і Марыя Дзмітрыеўна — апрацоўвалі каля чатырох гектараў зямлі. У сваёй роднай вёсцы хлопец атрымаў пачатковую адукацыю, потым вучыўся ў Рацімлянскай сямігодцы і Навагрудскім педагагічным вучылішчы.

Значны ўплыў на выбар Міхаілам свайго жыццёвага шляху аказала багатая гістарычнымі традыцыямі Навагрудская зямля. І па сённяшні дзень навуковец падтрымлівае цесныя сувязі са сваёй роднай Навагрудчынай. Справай гонару для Міхаіла Паўлавіча як аўтара і рэдактара была падрыхтоўка кнігі "Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Навагрудскага раёна", якая пабачыла свет у 1996 г. Не абмінае сваёй увагай Міхаіл Касцюк і канферэнцыі, прысвечаныя родным мясцінам. Зусім нядаўна ён выступіў з цікавым і змястоўным дакладам на Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Роля і месца Навагрудка ў гісторыі і культуры Еўропы" (10—11 ліпеня 2009 г.). У ім былі асветлены асноўныя этапы і важнейшыя рысы адміністрацыйнага статусу Навагрудка з моманту яго заснавання і да нашага часу.

У 1958 г. Міхаіл Касцюк паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Гродзенскага педагагічнага інстытута, а ў 1963 г. закончыў яго і атрымаў дыплом з адзнакай. Маладога спецыяліста накіравалі на працу дырэктарам Касадворскай васьмігадовай школы ў в. Баярская Навагрудскага раёна, а ў наступным годзе прызвалі на армейскую службу ў Мінск.

Пасля дэмабілізацыі ў 1965 г. Міхаіл Паўлавіч каля двух гадоў працаваў сакратаром камітэта камсамола Гродзенскага педагагічнага інстытута. Работа была складаная і адказная, аднак малады камсорг, пад кіраўніцтвам якога ў той час было некалькі тысяч чалавек, добра спраўляўся са сваімі абавязкамі. Таму, калі Міхаіл Касцюк выказаў жаданне "пайсці ў навуку", адпускаць яго не хацелі. Рашаючае значэнне мела падтрымка тагачаснага сакратара парткама Гродзенскага педагагічнага інстытута, удзельніка партызанскага руху на Гродзеншчыне, кандыдата філасофскіх навук Гургена Аміrханавіча Марцîросава. Міхаіл Паўлавіч па сёння падтрымлівае цесныя сувязі са сваёй Alma mater: літаральна кожны год удзельнічае ў навуковых канферэнцыях, якія ладзіць Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.



У снежні 1966 г. Міхаіл Паўлавіч паступіў у аспірантуру Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР. Пад кіраўніцтвам акадэміка Івана Сяргеевіча Краўчанкі ён заняўся распрацоўкай даволі складанай тэмы — працоўнай актыўнасці калгаснага сялянства Беларусі ў 1933—1940 гг., і ў 1969 г. паспяхова абараніў па ёй кандыдацкую дысертацыю.

Выдатныя інтэлектуальныя і арганізатарскія здольнасці абумовілі прызначэнне М.П.Касцюка ў 1970 г. на адказную пасаду вучонага сакратара Інстытута гісторыі АН БССР, а ў 1975—1981 гг. — вучонага сакратара Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



*Бацькі Міхаіла Паўлавіча Касцюка — Марыя Дзмітрыеўна і Павел Іосіфавіч.* Канец 1930-х гг.

Працуючы на гэтых пасадах, Міхаіл Паўлавіч прадаўжаў актыўна займацца навукова-даследчыцкай дзейнасцю, што ў выніку дало добры плён. У снежні 1979 г. ён паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю "Деятельность Компартии Белоруссии по идейно-политическому воспитанию крестьянства в период строительства социализма". Навуковым кансультантам гэтага даследавання з'яўляўся акадэмік Іларыён Мяфодзьевіч Ігнаценка.

У ліпені 1981 г. малады доктар гістарычных навук вярнуўся на працу ў Інстытут гісторыі АН БССР дзе стаў намеснікам дырэктара па навуковай рабоце.

У 1970—1980-я гг. асноўнае месца сярод навуковых інтарэсаў Міхаіла Паўлавіча займалі пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, у першую чаргу гісторыя сялянства. У гэты час з друку выйшлі тры манаграфіі М.П.Касцюка, прысвечаныя адзначанай тэматыцы: "Идейно-политическое воспитание крестьянства. Из опыта работы Компартии Белоруссии в период строительства социализма. (1926—1937 гг.)" (Мн., 1979), "Трудовой вклад крестьянства в победу и упрочение социализма (на материалах БССР)" (Мн., 1986) і "Социалистические ценности тружеников села: история, современность, перспективы" (Мн., 1989).

Разам з тым, кола навуковых інтарэсаў юбіляра не абмяжоўвалася гісторыяй сялянства. Ён грунтоўна даследаваў пытанні нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, гісторыі рабочага класа і інтэлігенцыі, што знайшло адлюстраванне на старонках 4-х томнай працы "История рабочего класса Белорусской ССР" (Т. 2. Мн., 1985), шэрагу навуковых і навукова-папулярных артыкулаў.

У лютым 1988 г. Міхаіл Паўлавіч стаў дырэктарам Інстытута гісторыі і на працягу амаль 12 гадоў узначальваў вядучую беларускую навуковую ўстанову ў галіне гісторыі. На пасадзе дырэктара Міхаіл Паўлавіч праявіў сябе як выдатны арганізатар і каардынатар гістарычнай навукі не толькі ў рамках Інстытута, але і рэспублікі ў цэлым.

1990-я гады сталі складаным і адначасова плённым часам для развіцця беларускай гістарычнай навукі. Менавіта тады перад калектывам Інстытута гісторыі паўстала маштабная задача: выпрацаваць такія канцэптуальныя падыходы да асвятлення гістарычных падзей, якія б у найбольшай ступені адпавядалі нацыянальна-дзяржаўным інтарэсам маладой суверэннай Рэспублікі Беларусь. Пад кіраўніцтвам Міхаіла Паўлавіча ў Інстытуце гісторыі было разгорнута даследаванне "белых плям" айчыннай гісторыі: пытанняў палітычнага і культурнага развіцця ВКЛ, розных аспектаў рэлігійнага жыцця, гісторыі беларускай эміграцыі, палітычных рэпрэсій перыяду 1920-х—1950-х гг.

Значным з'яўляецца і ўласны творчы здабытак М.П.Касцюка. Юбіляр папоўніў скарбонку беларускай гістарыяграфіі цікавымі арыгінальнымі даследаваннямі, што атрымалі прызнанне як у рэспубліцы, так і за яе межамі. Сур'ёзнасць, удумлівасць, імкненне ўнікнуць у самую сутнасць пытання, руплівасць і мэтанакіраванасць — адметныя рысы Міхаіла Паўлавіча. Яго пяру належаць больш за 250 навуковых прац, якія прысвечаны вывучэнню актуальных праблем айчыннай гісторыі, у тым ліку каля 20 індывідуальных і калектыўных манаграфій.

Вялікі інтарэс навуковай грамадскасці як у Беларусі, так і ў Расіі, выклікала яго манаграфія "Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі" (Мн., 2000). У кнізе на багатым фактычным матэрыяле аўтар раскрывае сутнасць бальшавіцкай сістэмы кіравання, даследуе прычыны яе ўзнікнення і механізм функцыяніравання, а таксама асаблівасці, характэрныя для Беларусі. У 2002 г. манаграфія была перавыдадзена ў Маскве Інстытутам расійскай гісторыі РАН.

Глыбокія веды ў спалучэнні з творчым падыходам дазволілі Міхаілу Паўлавічу не толькі ствараць уласныя грунтоўныя манаграфічныя даследаванні, але і выступаць у якасці навуковага рэдактара шэрага выданняў. Так, ён з'яўляўся галоўным рэдактарам і адным з аўтараў "Нарысаў гісторыі Беларусі" ў дзвюх частках, якія выйшлі ў 1994—1995 гг. Яго пяру належаць звароты да чытача і заключэнне, а таксама раздзелы, прысвечаныя аналізу грамадска-палітычнага жыцця рэспублікі ў 1920-я—1930-я гг.: "Тэндэнцыі грамадска-палітычнага жыцця" (20-я гады XX ст.), "Развіццё культуры" (у сааўтарстве з У.Палуянам), "Барацьба з "нацыянал-дэмакратызмам", "Усталяванне дыктатарскага рэжыму ў БССР", "Драматычны шлях калектывізацыі", "Рэгламентацыя грамадска-палітычнага жыцця", "Рэпрэсіі — самае цяжкае злачынства дыктатарскага рэжыму" (у сааўтарстве з У.Міхнюком).

Міхаіл Паўлавіч з'яўляецца кіраўніком навуковага творчага калектыву і адным з аўтараў працы "Гісторыя Мінска", што была апублікавана ў 2006 г. У 2007 г. было выдадзена падрыхтаванае аўтарскім калектывам пад кіраўніцтвам М.П. Касцюка навуковае даследаванне "Беларусь у сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсах 1946—2006 гг.". Структура кнігі, яе матэрыялы ў цэлым адрознiва-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



*Міхаіл Паўлавіч Касцюк з польскімі калегамі. 1999 г.*

юцца глыбінёй навуковага аналізу. Пяру юбіляра належаць чатыры параграфы калектыўнай працы "Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці", апублікаванай у 2008 г. У іх Міхаіл Паўлавіч прааналізаваў грамадска-палітычныя працэсы ў БССР у 1920-я—1930-я гг., а таксама складаны працэс станаўлення Рэспублікі Беларусь у кантэксце геапалітычных працэсаў канца 1980-х гг. — пачатку XXI ст.

Ва ўступе да першага тома шасцітомнага выдання "Гісторыя Беларусі", пяць тамоў якога ўжо апублікаваны ў 2000—2008 гг., Міхаіл Паўлавіч адзначае: "Максімальна поўнае, аб'ектыўнае, непалітызаванае даследаванне мінулага беларускага народа .... паспрые павышэнню аўтарытэту беларускага народа сярод сваіх суседзяў, а таксама ў Еўропе і свеце". Менавіта аб'ектыўнасць, імкненне заўсёды "кіравацца праўдай гісторыі" з'яўляюцца галоўнымі крытэрыямі шматграннай творчай дзейнасці акадэміка М.П.Касцюка.

Цвёрда ўпэўнены ў тым, што "без гістарычных ведаў і выкарыстання гістарычнага вопыту нельга паспяхова будаваць незалежную дзяржаву", Міхаіл Паўлавіч надае вялікую ўвагу папулярызацыі гістарычных ведаў. Ён з вялікай ахвотай выступае з цікавымі і змястоўнымі артыкуламі на старонках перыядычных выданняў, на радыё і тэлебачанні, на шматлікіх міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях, семінарах і сімпозіумах.

Не шкадуе свайго часу Міхаіл Паўлавіч і на падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў для гістарычнай навукі. Яго характэрнымі рысамі як навуковага кіраўніка з'яўляюцца добразычлівасць, давер і ўвага да новых, арыгінальных падыходаў пры даследаванні складаных гістарычных працэсаў. Пад кіраўніцтвам Міхаіла Паўлавіча былі паспяхова абаронены дзве доктарскія і 19 кандыдацкіх дысертацый. Даволі часта М.П.Касцюк выступае ў якасці эксперта і апанента пры падрыхтоўцы да абароны і падчас абароны шматлікіх дысертацый у навукова-даследчых і навучальных установах Рэспублікі Беларусь.

Паспяховая рознабаковая дзейнасць М.П.Касцюка, яго вялікі ўклад у развіццё гістарычнай навукі атрымалі прызнанне навуковай грамадскасці нашай дзяржавы і замежжа. У 1981 г. Міхаіл Паўлавіч быў узнагароджаны Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, у 1989 г. абраны членам-карэспандэнтам, а ў 1996 г. — акадэмікам НАН Беларусі. У 1998 г. М.П.Касцюк атрымаў дыплом сапраўднага акадэміка Цэнтральнай Еўрапейскай акадэміі навук і мастацтва. Паводле рашэння Міжнароднага навуковага савета Амерыканскага біяграфічнага інстытута, у 1999, 2002, 2005, 2006, 2007 гг. ён быў прызнаны Чалавекам года.

Міхаіл Паўлавіч Касцюк сустракае сваё 70-годдзе ў росквіце творчых сіл. Дырэкцыя Інстытута гісторыі НАН Беларусі, рэдакцыя "Беларускага гістарычнага часопіса", калегі, сябры і вучні шчыра і сардэчна віншуюць шаноўнага Міхаіла Паўлавіча з юбілеем і ад усёй душы жадаюць яму моцнага здароўя, новых творчых здабыткаў і поспеху ў здзяйсненні ўсіх яго планаў.

**Аляксандр Каваленя,**
*акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар*

**Валянцін Мазец,**
*старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі беларускай дзяржаўнасці Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ